Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 САКАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 45 (28155) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях пенсійнай рэформы**

СТАР. 2



**Адшукаць каханне праз стагоддзе**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# ЧАРОЎНЫ СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Учора ў сталіцы пачала сваю работу XII Міжнародная спецыялізаваная выстава «Свет дзяцінства — 2016». У экспазіцыі нямала цікавага для бацькоў і дзяцей — ад кніг да мэблі. Маленькіх наведвальнікаў асабліва зацікавяць цацкі і гульні, якіх на выставе таксама шмат.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Летась наша краіна сутыкнулася з сур'ёзнымі выклікамі ў знешнеэканамічнай сферы. Кан'юнктура складвалася адкрыта не на нашу карысць. Пагоршыліся ўмовы знешняга гандлю, знізіўся попыт на традыцыйных рынках, некаторыя з найбліжэйшых гандлёвых партнёраў Беларусі перажылі парад дэвальвацый. Усё гэта не магло не адбіцца на выніках знешняга гандлю за 2015 год. Яны сур'ёзна кантрастуюць з дасягненнямі ў знешнепалітычнай сферы, а статыстыка па знешнеэканамічнай дзейнасці не адлюстроўвае затрачаных намаганняў. Таму, грунтуючыся на выніках 2015 года, нам неабходна прааналізаваць аддачу ад інтэграцыйных намаганняў Беларусі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20838,00 | ▼ |
| Еўра | 22854,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 292,97 | ▲ |
| Укр. грыўня | 815,58 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

## ■ По сутнасці справы

## ВЫГАДНЫЯ ГРОШЫ



Некаторыя людзі цвёрда ўпэўнены ў тым, што толькі грошы робяць грошы. Але гэта зусім не так. Лепш за ўсё вашым грашовым сродкам дапаможа «размножыцца» патрэбная інфармацыя, дакладныя прынцыпы іх магчымага пераўтварэння, што ў рэшце рэшт і прыносіць пэўны даход. Менавіта такі своеасаблівы зарад жадання быць фінансава адукаваным можа пераўтварыцца ў рублёвы (валютны) эквівалент. Мне здаецца, старажытныя «фінансісты» не памыляліся, калі казалі, што грошы самі па сабе — усяго толькі косная матэрыя. Што «яны не думаюць, не рухаюцца і ўвесь час маўчаць, але ў іх выдатны «слых»: іх трэба правільна паклікаць, і яны абавязкова з'явяцца перад тымі, хто вырашыў з імі супрацоўнічаць».

І гэта праўда. Банкноты не мусяць хавацца ў панчохі ці слоікі. Грошы павінны працаваць у любым выпадку, нават тады (менавіта тады), калі поспехі ў эканоміцы часам не такія ідавочныя... Зберажэннямі трэба проста правільна кіраваць. Як гэта рабіць — тут кожны выбірае свой алгарытм. Мы ж, са свайго боку, паспрабуем вам у гэтым крышачку дапамагчы. Карэспандэнт «Звязды» прапануе цыкл матэрыялаў на гэту тэму. Першы матэрыял тычыцца будучых новаўвядзенняў у фінансавай сферы, якія звязаны з абкладаннем падаходным падаткам даходаў ад банкаўскіх укладаў.

СТАР. 4

## ■ Надвор'е

## НЯЎПЭЎНЕНАЯ ЦЕПЛЫНЯ

### Калі сёння прыгрэе да плюс 11, то ў панядзелак уначы магчымы замаразкі да мінус 7

**А на выхадныя нам трэба чакаць кароткачасовыя ападкі і слабы галалёд, паведамляюць спецыялісты Беларускага гідраметцэнтра.**

Увогуле, першыя дні сакавіка былі сапраўды цёплымі, калі тэмпературны фон перавышаў кліматычную норму на 4-8 градусаў. А ў выніку снежнае покрыва практычна сышло, толькі месцамі ў паўночных раёнах краіны яго вышыня яшчэ складае 1-2 сантыметры. Сёння на нашай тэрыторыі будзе гаспадарыць зона паніжанага атмасфернага ціску, таму па паўночна-заходняй палове пройдуць дажджы. У асобных раёнах магчымы туман. Максімальная тэмпература паветра складзе 5-11 цяпла.

У суботу ў Беларусь завітае атмасферны фронт, які рухаецца з поўначы на поўдзень. Уначы пераважна па паўночна-заходняй палове, а ўдзень — на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, па паўночным захадзе — з мокрым снегам. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, удзень будзе ад 1 цяпла па поўначы да плюс 8 градусаў па поўдні краіны.

Больш свежае і вільготнае паветра завітае да нас у нядзелю. Месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, а ўначы і раніцай на асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, удзень чакаецца ад нуля да плюс 5, а па поўдні месцамі да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня Беларусь трапіць пад уплыў антыцыклону, цэнтр якога будзе размяшчацца над поўднем Скандынаўскага паўвострава. У панядзелак і аўторак месцамі чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай месцамі слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы пахаладае, чакаецца ад 0 да мінус 5 градусаў, пры праясненнях — да 7 марозу. Удзень прагназуецца ад нуля да плюс 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ПАДЫСЦІ ЎВАЖЛІВА І ЎСЕБАКОВА

## Прэзідэнт разгледзіць тры варыянты павышэння пенсійнага ўзросту з магчымасцю паэтапнага ўвядзення гэтага рашэння з 1 студзеня 2017 года

**Такія вынікі нарады па пытаннях развіцця пенсійнай сістэмы, якую кіраўнік дзяржавы правёў учора.**

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што людзі актыўна абмяркоўваюць гэтую надзённую тэму. Пры гэтым галоўны пасыл — усе хочуць, каб пенсіі павышаліся і забяспечвалі нармальны ўзровень жыцця, а вось якім чынам дасягнуць гэтага, тут думкі часцяком разыходзяцца.

«Я сёння знаходжуся паміж дзвюх пазіцый. Па-першае, урад прапануе пенсійную сістэму значна ўдасканаліць. Прапановы ёсць розныя, пачынаючы ад расійскага ўзору, — адзначыў Прэзідэнт. — Гаворка ідзе пра павышэнне пакуль пенсійнага ўзросту, а затым і, магчыма, пра рэфармаванне ў цэлым усёй сістэмы, дашліфоўку або змены некаторых напрамкаў. Гэта адна пазіцыя, пазіцыя ўрада».

«З другога боку — насельніцтва. Скажу шчыра, па маіх звестках (я ўпэўнены, што яны дакладныя), мы пакуль не дасягнулі пераважнай большасці сярод насельніцтва, якая б падтрымлівала гэтую прапанову ўрада аб павышэнні пенсійнага ўзросту. Мы блізкія да паловы. І людзі адгукаюцца на нашы прапановы, просьбы, хай нават павольна, але пасля таго, як мы ім тлумачым, расказваем, рэкамендуем, яны разумеюць, пра што ідзе гаворка. Беларусы — людзі адукаваныя», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Я знаходжуся паміж двума патокамі меркаванняў: прапановы ўрада, заснаваныя на эканоміцы (і абсалютна тут я з імі салідарны), і поглядам народа, да якога я не прыслухацца не магу», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Я доўга думаў над гэтай праблемай і буду зыходзіць з аднаго прынцыпу, якім я карыстаюся заўсёды: не працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, эканоміцы, павінны кіраваць намі, а мы павінны кіраваць гэтымі працэсамі. І калі сітуацыя церпіць, можна пацярпець, але калі яна набліжаецца да таго рубікона, які немагчыма дапусціць і перайсці, значыць, трэба прымаць рашэнне, каб потым гэтыя працэсы не кіравалі намі, таму што гэта будзе сабе даражэй як у палітыцы, эканоміцы, так і ў фінансах», — лічыць беларускі лідар.

«Трэба ўважліва і ўсебакова разгледзець усе аспекты і тэмы і выпрацаваць найбольш аптымальныя варыянты, каб наша пенсійная сістэма была надзейнай і працавала без збояў на карысць людзей», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць справядлівым, калі павышэнне пенсійнага ўзросту закране ўсіх. «Але трэба ўлічваць усё: розніцу працягласці жыцця мужчын і жанчын, спецыфіку горада і вёскі, умовы працы ў некаторых сферах і іншыя фактары», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў пытанні павышэння пенсійнага ўзросту трэба ісці ад жыцця, улічваючы рэальныя працэсы ў дэмаграфічным становішчы і не пагаршаючы матэрыяльнае.

На яго думку, на карысць гэтай меры два фактары. Па-першае, значныя змены ў структуры грамадства, дзе колькасць работнікаў скарачаецца, а колькасць пенсіянераў пастаянна расце. Так, на 100 працоўных прыпадае больш за 60 пенсіянераў. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэтая тэндэнцыя будзе абвастрацца і прапорцыі будуць разыходзіцца.

«Па-другое, дзякуючы нашай сацыяльна-эканамічнай палітыцы людзі сталі жыць даўжэй. Сярэдняя працягласць жыцця павялічылася ў параўнанні з 1990-мі на 5 гадоў. Таму 55-60 гадоў — гэта нармальны ўзрост», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго здзіўляе ў сацыялагічных даследаваннях, што частка насельніцтва, якая працуе, нармальна ўспрымае павышэнне пенсіённага ўзросту, а не падтрымліваюць гэтую меру пенсіянеры. «Пенсіянерам трэба растлумачыць: не дай Бог мы паўстанем перад фактам, што прыйдзецца паніжаць пенсію! — адзначыў Прэзідэнт. — Вось гэтага нельга дапусціць. Таму што ў нашых пенсіянераў і так пенсіі невялікія. І скарачаць іх ні ў якім разе нельга».

Прэзідэнт закрануў і яшчэ адзін бок гэтай праблемы. Калі ў краіне пойдуць на павышэнне пенсійнага ўзросту, то неабходна будзе ствараць яшчэ больш працоўных месцаў. І, на яго думку, гэта будзе добрым стымулам для іх стварэння. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта павінна не проста ўлічвацца, а быць добра пралічаным.

Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што ў выпадку павышэння пенсійнага ўзросту гэты працэс будзе, хутчэй за ўсё, паэтапным, каб насельніцтва адаптавалася.

«Трэба рабіць усё акуратна. І калі мы гаворым пра тое, што чалавек — галоўнае ў нашай палітыцы, трэба ўсё ж такі прыслухоўвацца да чалавека або пераконваць яго, як мы гэта і робім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што праблемай павышэння пенсійнага ўзросту заклапочаны не толькі ў Беларусі, але таксама ў Расіі і ў Казахстане. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што не адзін раз і вельмі сур'ёзна абмяркоўваў гэтую праблему з кіраўніцтвам Расійскай Федэрацыі. «У нас абсалютна супадаюць пазіцыі. Нас абставіны вымушаюць, падштурхоўваюць да вырашэння пытання пенсійнага ўзросту. Пытанне — калі гэта рабіць», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Паводле яго слоў, ён і Уладзімір Пуцін дамовіліся аб тым, што будуць пераконваць насельніцтва і ў Расіі, і ў Беларусі, да гэтага таксама падключыцца Казахстан.

Прэзідэнт адзначыў, што Казахстан ужо зрабіў крок да павышэння пенсійнага ўзросту, аднак не зусім рашучы, і сёння перад ім стаіць задача павышэння пенсійнага ўзросту другі раз.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што нават у самых заможных краінах пенсійны ўзрост значна вышэйшы, чым у Беларусі: недзе на 5, недзе на 10 гадоў. У якасці прыкладу ён прывёў Германію, у якой, паводле яго слоў, пенсійны ўзрост наступае ў 67 гадоў. Прэзідэнту было прапанавана тры варыянты павышэння пенсійнага ўзросту. Усе варыянты эканамічна пралічаны, у тым ліку з прыцягненнем вучоных.

Першы варыянт прадугледжвае выхад на пенсію жанчын у 60 гадоў і мужчын — у 65. На думку ўрада, гэта самы эканамічна прымальны варыянт, паколькі дае добрыя паказчыкі.

У якасці другога варыянту разглядаецца магчымасць выхаду на пенсію жанчын у 60 гадоў, мужчын — у 63 гады.

Трэці варыянт прадугледжвае ўвядзенне пенсійнага ўзросту з 58 гадоў для жанчын і з 63 — для мужчын.

Што тычыцца тэмпу, з якім плануецца павялічваць пенсійны ўзрост, то найбольш аптымальным з'яўляецца з крокам у паўгода.

Канчатковае рашэнне па пытанні павышэння пенсійнага ўзросту будзе прынята пасля шырокага абмеркавання, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што абавязкова павінна быць улічана думка грамадства, вельмі важная зваротная сувязь. Толькі пасля гэтага будзе прымацца канчатковае рашэнне.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на неабходнасць стварэння новых працоўных месцаў, паколькі ў выпадку павышэння пенсійнага ўзросту на рынку працы затрымаецца некаторая колькасць грамадзян. Але ж ёсць таксама выпускнікі ВНУ, моладзь, якія павінны мець гарантыю на першае працоўнае месца.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт даручыў ствараць больш магчымасцяў для развіцця малога і сярэдняга бізнесу.

Кіраўнік дзяржавы мае намер у хуткім часе правесці яшчэ адну нараду, прысвечаную гэтым пытанням, на якой будзе прынята канчатковае рашэнне.




■ Наша пазіцыя

## ЦІ БЫЦЬ СМЯРОТНАМУ ПАКАРАННЮ — ВЫРАШЫЦЬ ГРАМАДСТВА

**Пытанне адмены смяротнага пакарання ў нашай краіне не можа вырашацца без уліку грамадскай думкі. Пра гэта заявіў намеснік міністра замежных спраў нашай краіны Валянцін Рыбакоў.**

«Дыялог у грамадстве па гэтым пытанні ідзе, — адзначыў намеснік міністра. — Гэта факт. Дыялог у правільным кірунку, паважлівы. Гэта не наш дыялог з Еўропай пра тое, што мы з пункту гледжання Еўропы павінны зрабіць. Гэта пытанне, якое будзе вырашаць беларускае грамадства, беларускі народ. Пакідаць гэтую меру пакарання? Адмяняць яе ці ўводзіць мараторый? Зразумела, палітыкі могуць сказаць сваё важкае слова, але не ўлічваць грамадскай думкі мы не можам і не будзем».

Намеснік міністра таксама адзначыў, што нядаўняя адмена санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі наўпрост не звязана з пытаннем адмены смяротнага пакарання. «Ніхто не збіраецца таргавацца і мяняць адны каштоўнасці на іншыя», — заявіў дыпламат.

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ**

## НА ВАША ПЫТАННЕ ЁСЦЬ АДКАЗ!

Практыка стасункаў з чыноўнікамі і вырашэння праблем пры дапамозе прамых тэлефонных ліній існуе ўжо больш за год і будзе працягвацца далей. Без сумненняў, яна прыносіць свой плён. Уцяпліць дом, добраўпарадкаваць вуліцу або прыватызаваць кватэру — з такімі пытаннямі звяртаюцца жыхары краіны да мясцовых улад. Некаторыя праблемы атрымліваецца вырашаць на працягу некалькіх дзён, штосьці патрабуе больш часу, але на кожнае пытанне ёсць адказ.

**12 сакавіка з 9.00 да 12.00 Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць чарговыя «прамыя лініі». На сувязь з насельніцтвам у гэтую суботу выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам —** намеснік старшыні
ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам —** першы намеснік старшыні
ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам —** старшыня
ДВОРНІК Уладзімір Андрэевіч (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам —** кіраўнік спраў
ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);
**Мінскі аблвыканкам —** кіраўнік спраў
МАРКЕВІЧ Іван Станіслававіч (80175004160);
**Магілёўскі аблвыканкам —** кіраўнік спраў
ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);
**Мінскі гарвыканкам —** старшыня
ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

■ Разумнікі і разумніцы

## ЗАЙМАЦЦА НАВУКАЙ НІКОЛІ НЕ РАНА

**Больш як 150 навучэнцаў атрымалі ўзнагароды Міністэрства адукацыі па выніках рэспубліканскага конкурсу-канферэнцыі работ даследчага характару па 18 вучэбных прадметах.**

На конкурс папярэдне было пададзена больш за тысячу заявак. У заключным (вочным) этапе прынялі ўдзел 375 навучэнцаў з Беларусі, а таксама прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі і Украіны. Найлепшыя вынікі паказалі навучэнцы горада Мінска і Мінскай вобласці.

Самыя цікавыя даследаванні і праекты былі прысвечаны актыўным утварэнням на сонцы, вызначэнню ўзросту зоркавых скапленняў, мадэляванню перасячэння транспартных патокаў, сістэме аўтаматызаванага ўліку наведвальнасці навучэнцаў па тэхналогіі Bluetooth, стварэнню прапелералёта і г.д.

Журы, у склад якога ўвайшлі 12 дактароў і 41 кандыдат навук, вызначыла пераможцаў канферэнцыі і адабрала тых, хто будзе прадстаўляць Беларусь на канферэнцыі маладых вучоных краін Еўрапейскага саюза і міжнароднай канферэнцыі юных вучоных па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы і экалогіі.

Члены журы, якія ацэньвалі работы школьнікаў на розных секцыях, прыйшлі да аднадушнай высновы: узровень падрыхтоўкі работ, а менавіта фармулёўка гіпотэзы, тэарэтычная абгрунтаванасць, самастойнасць даследаванняў, аналітычныя выкладкі вынікаў эксперыменту, афармленне работы, культура і логіка выступлення навучэнцаў, глыбіня валодання матэрыялам, граматнасць пры адказах на пытанні па тэме даклада істотна выраслі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## НЕЛЕГАЛЫ, ДА ВАС ІДУЦЬ!

**Згодна са статыстычнымі звесткамі, аб'ём выкананых работ па бытавых паслугах за мінулы год склаў у краіне больш за 10,6 трыльёна рублёў.**

Разам з тым, па ацэнцы спецыялістаў упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама, каля 20 працэнтаў аб'ёму бытавых паслуг знаходзіцца ў цені, што ў доларавым эквіваленце складае да 135 мільёнаў. Пра гэта, у прыватнасці, гаварылася на калегіі Міністэрства гандлю падчас разгляду пытанняў функцыянавання арганізацый бытавога абслугоўвання. У сувязі з гэтым міністэрствам разам з іншымі зацікаўленымі бакамі будуць праведзены кантрольныя мерапрыемствы па спыненні аказання нелегальных паслуг, у тым ліку і ў гаражных кааператывах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Крок да дарослаcці

# РАЗАМ З ПАШПАРТАМ — АДКАЗНАСЦЬ



**Напярэдадні Дня Канстытуцыі ў сталіцы стартавала ўсебеларуская патрыятычная акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!». У Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці 27 чатырнаццацігадовых беларусаў з усіх куткоў краіны — выдатнікаў вучобы, удзельнікаў навукова-практычных канферэнцый, пераможцаў і прызёраў рэспубліканскіх спаборніцтваў, фестываляў, конкурсаў, прадметных алімпіяд — атрымалі свае першыя пашпарты.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Такі рытуал уручэння галоўнага дакумента — гэта ключавы момант для фарміравання тых каштоўнасцяў, якія дзяржава хоча бачыць у моладзі, — зазначыў падчас мерапрыемства **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ.** — Мы хочам давесці маладым, што Канстытуцыя краіны гарантуе ім неад'емныя правы, але там, дзе ёсць іншы чалавек, з'яўляюцца яшчэ і пэўныя абавязкі. Разуменне гэтага трэба фарміраваць, у тым ліку і пры дапамозе падобных акцый. Менавіта таму мерапрыемства атрымала шырокую падтрымку і ў маладзёжным асяроддзі, і ў дзяржаўных структурах, і ў грамадскіх арганізацыях. Яно праводзіцца ўжо не першы год, і я ўпэўнены, што такі фармат будзе добрай традыцыяй і надалей.

Акрамя непасрэдна пашпартоў, удзельнікі акцыі атрымалі ў падарунак і ўжо традыцыйны альбом пад назвай «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь». Для юнакоў і дзяўчат правялі экскурсію па Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Дарэчы, асобныя ўдзельнікі віншавалі арганізатараў сваімі незвычайнымі падарункамі ў адказ. Напрыклад, **вучаніца 9 класа Мірнаўскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна Юлія ЖУРУН** зрабіла для гасцей вышыўку з нацыянальным арнаментам.

— Для мяне сённяшняя акцыя сапраўды значыць вельмі шмат, — расказала дзяўчына. — Па-першае, я ганаруся тым, што апынулася ў ліку тых, хто вызначыўся пэўнымі поспехамі — гэта своеасаблівае прызнанне. А па-другое, атрыманне пашпарта — гэта вельмі важны момант у жыцці любога чалавека, бо гэты дакумент накладвае на свайго ўладальніка вялікую адказнасць.

Патрыятычная акцыя будзе працягвацца да 15 сакавіка, калі ў Беларусі будзе адзначацца Дзень Канстытуцыі. Пашпарты юнакам будуць уручаць грамадскія дзеячы і прадстаўнікі ўладных структур ва ўсіх рэгіёнах.

— Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі з'яўляецца ініцыятарам акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!» з 2004 года, — распавёў **першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ.** — Дзясяткі тысяч юнакоў і дзяўчат за гэты час атрымалі галоўныя ў сваім жыцці дакументы менавіта ў такім фармаце.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Сезон

# ВЯСНА — ЧАС ПАЛЯВАННЯ НА ПТУШЫНЫХ

## З другой суботы сакавіка адкрываецца веснавы сезон палявання на птушыную дзічыну

**У адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, з 12-га чысла можна будзе паляваць на гусей белалобых, гуменнікаў, шэрых, канадскіх казарак, а таксама качараў: крыжанкі, чырка-траскунка, чырка-свістунка, чэрнець чырвонагаловую і чэрнець чубатую.**

абмежаванняў. Паляванне павінна праводзіцца толькі са скрадка. Толькі з яго і толькі з падзываннем можна паляваць і на качараў. Пры гэтым абавязкова выкарыстанне ўякасці сродкаў прываблівання альбо падсадной качкі (качак), альбо чучала (чучалаў) і вабіка (вабікаў). Дазваляецца выкарыстоўваць падсадную качку адначасова з чучалам і (або) вабікам. Прымяненне вабіка без чучала забаронена.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З 20 сакавіка будзе дазволена паляванне на самцоў глушца і цецерука на таках. З 2 красавіка — на самцоў слонкі «на цязе». Веснавы сезон палявання на гусей, качараў і слонку працягнецца да 8 мая, на глушца і цецерука — да 10 мая. Дазволены час палявання на гусей і качараў — светлы час сутак (акрамя перыяду з 11 да 18 гадзін), на слонку — з 18 да 22 гадзін, на глушца і цецерука на таках — з 3 да 9 гадзін.

— Агульная працягласць веснавога сезона палявання на гусей і качараў не можа перавышаць чатырох тыдняў (28 дзён) запар у прадугледжаным правіламі дыяпазоне (у 2016 годзе — з 12 сакавіка па 8 мая). Канкрэтныя тэрміны вызначаюцца рашэннямі карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў, — расказала **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.** — Пры паляванні на гусей дазваляецца выкарыстоўваць падсадных жывёл, чучалы, профілі, вабікі (у тым ліку электронныя) і іншыя сродкі прывабліванне без

Для ўстаноўкі і (або) зняцця падсадных качак, профіляў, чучалаў і пад'ёму здабытай дзічыны паляўнічыя могуць карыстацца маламернымі судамі без рухавікоў, нягледзячы на тое, што ў веснавы перыяд (у сувязі з нерастам) выкарыстанне маламерных судоў у рыбалоўных угоддзях забаронена. Для пошуку і падачы дзічыны пры паляванні на гусей, качараў і слонку дапускаецца выкарыстанне паляўнічых сабак — тэр'ераў, такс, выжлаў, спаніэляў, рэтрывераў і водных сабак.

На працягу ўсяго веснавага сезона захоўваецца забарона на паляванне на гусей белалобых, гуменнікаў, шэрых, канадскіх казарак, крыжанак, чыркоў-траскункоў, чыркоў-свістункоў, чэрнець чырвонагаловую, чэрнець чубатую на тэрыторыі асобных паляўнічых угоддзяў. Забарона ўстаноўлена пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якой вызначаны межы забароненых для палявання зон.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ

### ДА АЭРАПОРТА — У АБ'ЕЗД

**Рух усіх відаў транспарту закрываецца па аўтадарозе ад а/д М1 да Нацыянальнага аэрапорта «Мінск».**

Абумоўлена гэта правядзеннем будаўнічых работ. У сувязі з гэтым, інфармуе прадпрыемства «Мінсктранс», з 9 сакавіка рух аўтобуснага маршруту 173Э «Сокал — Нацыянальны аэрапорт «Мінск» будзе арганізаваны ў аб'езд па аўтадарозе М1 Брэст — Масква, аўтадарозе М2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск» у абодвух кірунках. Такі графік будзе дзейнічаць да моманту завяршэння будаўнічых работ, як маркуецца, да ліпеня — верасня гэтага года.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### ШЧАСЛІВЫ ШАНЦ ВАЛЕРЫІ АЗАРАНКІ

**У Магілёве віншуюць сваю зямлячку Валерыю Азаранку з чарговай перамогай. Яна стала ўладальніцай Гран-пры міжнароднага фестывалю «Шчаслівы шанц» у Расіі.**




Валерыя не аднойчы пацвярджала званне найлепшай вакалісткі на міжнародных арэнах у Балгарыі, Украіне, Расіі і Беларусі. Стымулам для далейшых поспехаў стаў нядаўні ўдзел у праекце ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага гарвыканкама «Азбука беларускага арнаменту». На вуліцах горада з'явіліся білборды, упрыгожаныя беларускімі сімваламі энергіі, росквіту і сонца. Побач з арнаментамі — партрэты зорак Магілёўшчыны, якія спрыяюць захаванню нацыянальных духоўных традыцый і развіццю беларускай культуры. Сярод іх ёсць і Валерыя.

Фестываль «Шчаслівы шанц», у якім прымалі ўдзел калектывы, салісты і педагогі-канкурсанты дзіцячых школ мастацтваў, цэнтраў дзіцячай, народнай творчасці, студэнты навучальных устаноў, прафесійныя выканаўцы, хоры, аркестры, ансамблі, тэатры з розных краін, стаў знамянальным яшчэ дзя адной юнай магілёўскай спявачкі — Анастасіі Гарнічар. У сваёй узроставай катэгорыі яна перамагла ў намінацыі «эстрадны вакал». Абедзве дзяўчынкі займаюцца вакалам у Магілёўскай гімназіі №1 у педагога па вакале Вольгі Гарнічар.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### МЕСЯЦ ЗНІЖАК: І НЕ ДРОБЯЗЬ, І ПРЫЕМНА

**Дні зніжак будуць праходзіць у мінскіх універмагах на працягу ўсяго сакавіка, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Так, гандлёвы дом «На Нямізе» 20-працэнтную зніжку дасць пакупнікам на ўсе нехарчовыя тавары 12, 19 і 23 сакавіка, універмаг «Беларусь» — 15 і 25 сакавіка, ГУМ — 17 і 31 сакавіка. Набыць тавар танней на 17 працэнтаў гараджане і госці сталіцы змогуць 12 сакавіка ў ЦУМе. Зніжку ў 15 працэнтаў падорыць пакупнікам «Кірмаш» 16, 23 і 30 сакавіка, крама «1000 дробязяў» — 24 сакавіка. Да канца сакавіка ў краме «Свет касметыкі» пры куплі прадукцыі ЗАТ «Вітэкс» на суму звыш 250 тысяч у падарунак можна атрымаць дысконтную карту. Таксама да 31 сакавіка ў фірменных крамах «Марка» на 40 працэнтаў зніжаны цэны на зімовы абутак, на 20 працэнтаў — на дэмісезонны, а таксама на ўсе скургалантарэйныя вырабы вытворчасці «Вітміл».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### ПАДАТАК У ПАМЕРЫ КАЛЯ 300 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

**Менавіта такую суму падаходнага падатку павінен заплаціць жыхар сталіцы пасля падачы ў інспекцыю дэкларацыі аб даходах па выніках года.**

Паводле інфармацыі спецыялістаў аддзела падаткаабкладання фізічных асоб інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) па горадзе Мінску, на пачатак сакавіка ў падатковыя інспекцыі сталіцы было прадстаўлена больш за 9,4 тысячы падатковых дэкларацый (разлікаў) за мінулы год па падаходным падатку з фізічных асоб.

У сталічнай інспекцыі МПЗ паведамілі, што на 9 сакавіка амаль 6 тысяч з гэтых дэкларацый ужо разлічаны, а сума прад'яўленага да аплаты падаходнага падатку склала 124,1 млрд рублёў. Пакуль найбольшы даход, задэклараваны жыхаром сталіцы, склаў 60,3 млрд рублёў. Менавіта з гэтай сумы быў падлічаны і найбольшы падаходны падатак у памеры 6,3 млрд рублёў (каля 300 тысяч долараў), які прад'яўлены да аплаты на падставе прадстаўленай дэкларацыі.

Нагадаю, што ў Беларусі традыцыйна ў пачатку года стартуе дэкларацыйная кампанія, падчас якой грамадзяне, якія атрымалі даходы за мяжой (а таксама і ў іншых выпадках) напярэдадні, абавязаны рабіць справаздачу аб гэтым. Кампанія дэкларавання завяршылася 1 сакавіка. Цяпер падаткаплацельшчыкі-дэкларанты павінны ў тэрмін да 15 мая разлічыцца з дзяржавай па аплаце падаходнага падатку ў бюджэт краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by



# ПАДАТАК НА ПРАЦЭНТЫ З «КАРОТКІХ» ГРОШАЙ

## Што трэба ведаць, каб і даход атрымаць, і з падатковай інспекцыяй не «пасварыцца»

**Сёлета з першых дзён красавіка ў краіне пачынаюць дзейнічаць асобныя падпункты Дэкрэта кіраўніка дзяржавы №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)», якія рэгулююць парадак падаткаабкладання падаходным падаткам даходаў у выглядзе працэнтаў, атрыманых па банкаўскіх укладах (дэпазітах), а таксама грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку.**

***Для большай зразумеласці і практычнага прымянення палажэнняў гэтага Дэкрэта Міністэрствам па падатках і зборах (МПЗ) разам з Нацыянальным банкам краіны было падрыхтавана сумеснае тлумачэнне аб парадку аплаты падаходнага падатку кліентамі банкаўскай сістэмы ў самых розных выпадках. Карэспандэнт «Звязды» паспрабаваў адаптаваць гэтую фінансавую інструкцыю для неспецыялістаў.***

### ДАХОД ПА ЎКЛАДАХ — КРЫХУ МЕНШЫ

Яшчэ летась, пасля аб'яўлення аб гэтым новаўвядзенні, некаторыя мае знаёмыя адразу спужаліся і хацелі нават тэрмінова здымаць грошы з рахункаў. А чаго спужаліся? Ды проста нехта пусціў пагалоску, што грошы ў банках абкладуць падаткам, пасля чаго на выхадзе ўласнік грошай ніякага прыбытку і не атрымае, і нават нешта і страціць.

Але гэта не так. Нават зусім не так! У красавіку падаткам будуць абкладацца не грошы насельніцтва на ўкладах, а толькі налічаныя працэнты па дэпазітах. Дакладней, падаткам абкладаецца даход, які чалавек атрымлівае ад банка за карыстанне яго грашыма. Больш за тое, падаткам такі даход абкладаецца ў канкрэтных выпадках. Аб гэтым мы і пагаворым.

### ТОЛЬКІ НОВЫЯ ДАГАВОРЫ, І ТО НЕ ЎСЕ

Увогуле, Дэкрэт №7 распаўсюджвае сваё дзеянне толькі на дагаворы па адкрыцці банкаўскіх укладаў, якія будуць заключаны сёлета з 1 красавіка. У каго ўжо ёсць дэпазіт з банкам на 1, 2 ці нават 5 гадоў, то далей можна нават і не чытаць...

А красавік ужо на парозе. Пасля гэтай даты па новых дагаворах падаходным падаткам будзе абкладацца даход па ўкладах, калі тэрмін фактычнага размяшчэння грашовых сродкаў на рахунках складае менш за адзін год у беларускіх рублях або менш за два гады ў замежнай валюце. Тут адразу адзначу, што на мінімальныя даходы па ўкладах (у памеры стаўкі па дэпазіце да запатрабавання і меншай (звычайна — да 3% гадавых у валюце)) падаткі ўвагу ўвогуле не звяртаюць. Гэта была тэорыя. Далей будзе практыка.

Напрыклад, чалавек 5 красавіка 2016 года заключыў дагавор дэпазіту тэрмінам на 3 месяцы пад 20% гадавых. Паклаў у банк 10 млн рублёў. Праз тры месяцы дагавор быў скасаваны і кліент забраў свае грошы і налічаныя працэнты. Калі падлічыць, то кліент за 3 месяцы зарабіць у банку са свайго ўкладу 500 тысяч рублёў. Аднак тэрмін фактычнага размяшчэння гэтых грашовых сродкаў на рахунку склаў менш за адзін год і памер працэнтнай стаўкі быў большы за мінімальную стаўку (да запатрабавання). Таму гэтыя працэнты з «кароткіх» грошай цяпер абкладаюцца падаходным падаткам у памеры 13%. Памер падатку складзе 65 тысяч рублёў. Атрымалася, што даход з дэпазіту стаў не 500 тысяч, а 435 тысяч рублёў. Мне здаецца, што розніца не крытычная. Так, крышку сумна (бо менш), але справядліва, бо грошы ад вас банк атрымлівае на кароткі тэрмін.

### УЛІЧВАЕЦЦА ТЭРМІН ЗНАХОДЖАННЯ ПА КОЖНАЙ СУМЕ

У распрацаванай спецыялістамі інструкцыі тлумачыцца, што пад фактычным тэрмінам размяшчэння грашовых сродкаў на рахунку банкаўскага ўкладу (дэпазіту), на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку маецца на ўвазе тэрмін знаходжання грашовых сродкаў на названых рахунках з даты ўнясення грашовых сродкаў на рахунак да даты іх зняцця (вяртання).

Асобна аналітыкі звяртаюць увагу на тое, што пачаткам тэрміну размяшчэння грашовых сродкаў лічыцца дата ўнясення кожнай канкрэтнай грашовай сумы на рахунак (першапачатковага ці дадатковага ўзносу). А заканчэннем тэрміну размяшчэння — дата зняцця грашовай сумы з рахунку (частковае зняцце або поўнае вяртанне). Менавіта тут існуе адзін прынцыповы нюанс. Так, калі кліент часткова здымае грошы з рахунку, то лічыцца, што ён здымае іх з той часткі, якая мае найменшы тэрмін фактычнага размяшчэння на такім рахунку. І тут прапануем «разбор палётаў».

Напрыклад, чалавек 10 красавіка паклаў у банк на дэпазіт 10 млн рублёў на два гады. Потым 1 мая сёлета ён папоўніў рахунак (зрабіў дадатковы ўзнос) яшчэ на 2 млн рублёў. 15 ліпеня гэтага ж года кліент зняў з рахунку частку грошай — 500 тысяч рублёў. Што мы маем далей?

Па нашым алгарытме атрымліваецца, што частковае зняцце 500 тысяч было з той часткі грошай, якія прыпадаюць на дадатковы ўзнос, г. зн. з тых сродкаў, якія маюць найменшы тэрмін фактычнага размяшчэння ва ўкладзе (дэпазіце). А вось па астатняй суме ўзносу адлік фактычнага тэрміну размяшчэння працягваецца. Як бачым, і тут у кліента ёсць поле для манеўру.

### ЗУСІМ БЕЗ ІХ

Інструкцыя канкрэтна тлумачыць сітуацыю аб тым, каго з банкаўскіх кліентаў гэтыя падаткі ўвогуле не павінны турбаваць. Усё проста. Заключыў чалавек з банкам дагавор па ўкладзе (дэпазіце) у беларускіх рублях тэрмінам на адзін год і больш або ў замежнай валюце — на два гады і больш, тады атрыманыя кліентам даходы (працэнты і капіталізацыя працэнтаў) падаткам не абкладаюцца незалежна ад памеру працэнтнай стаўкі. Праўда, ёсць выключэнні.

**Працэнты з «кароткіх» грошай цяпер абкладаюцца падаходным падаткам у памеры 13%.**

Гэта будуць два выпадкі. Па-першае, калі чалавек датэрмінова закрыў уклад або часткова зняў з яго грошы (тады фактычны тэрмін размяшчэння грашовых сродкаў на рахунку банкаўскага ўкладу (дэпазіту) складае менш за адзін год па ўкладах у беларускіх рублях і менш за два гады па ўкладах у валюце).

Другі выпадак тычыцца папаўнення ўкладу, калі атрымліваецца, што дадатковы ўзнос грошай на дэпазіт будзе ляжаць у банку менш за год у рублях, або менш за два гады ў валюце. Менавіта ў гэтых выпадках і на гэтыя «кароткія» грошы распаўсюджваецца правіла абкладання падаходным падаткам.

### ХТО СПАГАНЯЕ, ЯК І КАЛІ?

Спагнанне ў фізічнай асобы падаходнага падатку ажыццяўляецца падатковым агентам (банкам) за кошт любых грашовых сродкаў, якія выплачваюцца кліенту банкам, у тым ліку ўласных грашовых сродкаў фізасобы, якія былі размешчаны ў банкаўскі ўклад (дэпазіт) або ляжалі на бягучых (разліковых) банкаўскіх рахунках.

Пералічэнне ў бюджэт утрыманага падаходнага падатку з даходаў у выглядзе працэнтаў па банкаўскіх укладах (дэпазітах), а таксама па грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучых (разліковых) банкаўскіх рахунках, ажыццяўляецца не пазней за дзень пасля фактычнага атрымання чалавекам такіх даходаў.

На практыцы гэта будзе так. Калі чалавек 1 мая паклаў у банк 20 млн рублёў на год (заключыў дагавор) пад 25% гадавых, тады фінансавая ўстанова будзе выплачваць яму працэнты, якія падаходным падаткам не абкладаюцца. Ускладнім сітуацыю. Напрыклад, потым кліент 20 жніўня робіць частковае зняцце грошай з укладу (дэпазіту) у памеры 5 млн рублёў.

Што атрымаем далей? Гэтыя 5 млн рублёў ляжалі на ўкладзе менш за год, таму даходы з гэтакой сумы абкладаюцца падаходным падаткам.

Калі астатнія грошы, якія засталіся ва ўкладзе (дэпазіце) пасля частковага зняцця (15 млн рублёў), будуць фактычна ляжаць на ўкладзе на працягу года, то налічаныя на іх банкам працэнты падаходным падаткам не абкладаюцца.

### ПРА ДЭПАЗІТЫ Ў СПАДЧЫНУ

У афіцыйным дакуменце гаворыцца, што факт атрымання банкаўскага ўкладу (дэпазіту) у спадчыну не з'яўляецца падставай для датэрміновага вяртання ўкладу па дагаворы тэрміновага безадзыўнага або ўмоўнага безадзыўнага ўкладу спадчыннікам укладчыка, а даходы ў выглядзе працэнтаў, атрыманыя па ўказаных укладах (дэпазітах), падлягаюць падаткаабкладанню ў парадку, які вызначаны заканадаўствам.

### ТАКІЯ ЎКЛАДЫ ДЭКРЭТ НЕ «ЗАЧЭПІЦЬ»

Асобна ў нашай інструкцыі гаворыцца і аб тым, што дзеянне Дэкрэта №7 не распаўсюджваецца на:

- банкаўскія ўклады (дэпазіты) каштоўных металаў і (або) каштоўных камянёў;
- банкаўскія ўклады, аформленыя ў якасці ашчадных сертыфікатаў;
- на грашовыя сродкі, перададзеныя крэдытадавальніку для забеспячэння выканання абавязацельстваў па дагаворы ў выглядзе гарантыйнага дэпазіту грошай.

### ВЯРТАННЕ ЗАЛІШНЕ ЎТРЫМАНАГА

Вяртанне залішне ўтрыманага падаходнага падатку ажыццяўляецца падатковым агентам (банкам) у адпаведнасці з палажэннямі Падатковага кодэкса Беларусі.

Так, у выпадку спынення падатковым агентам (банкам) выплат даходаў фізічнай асобе, гэтая фінансавая ўстанова ажыццяўляе кліенту вяртанне залішне ўтрыманага падаходнага падатку. Такое вяртанне робіцца ў межах сум падатку, фактычна ўтрыманага і пералічанага ў бюджэт нашай краіны.

### ДЛЯ РАСІЯН — 10%

У прэс-службе МПЗ нам паведамілі, што наша краіна прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім нацыянальнага падатковага заканадаўства.

Такім чынам, калі нормамі міжнародных дагавораў прадугледжаны іншы памер стаўкі падаходнага падатку ў параўнанні са стаўкай падаходнага падатку ў памеры 13%, то прымяняецца стаўка падатку, прадугледжаная міжнародным дагаворам.

Калі ж Падатковым кодэксам Беларусі і (або) іншымі заканадаўчымі актамі дзяржавы прадугледжаны больш ільготныя ўмовы падаткаабкладання, чым тыя, якія вызначаны міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, то прымяняюцца палажэнні Падатковага кодэкса і (або) іншых заканадаўчых актаў нашай краіны.

Разам з тым спецыялістамі ўдакладняецца, што ў гэтым выпадку кліенты фінансавых устаноў павінны прад'явіць падатковаму агенту (банку) пацвярджэнне таго, што яны з'яўляюцца рэзідэнтамі замежнай дзяржавы, з якой маецца міжнародны дагавор Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання. Гэты дакумент-пацвярджэнне можна прынесці ў банк як да, так і пасля аплаты падаходнага падатку. Зразумела, што лепш зрабіць гэта загадзя, бо...

Калі такая папера будзе прынесена ў банк адразу, то падаткаабкладанне даходаў (працэнты па ўкладах) будзе ажыццяўляцца згодна з міжнародным дагаворам, а падаходны падатак утрымаюць і пералічаць у бюджэт па паніжаных падатковых стаўках. Пры непадачы падатковаму агенту (банку) такога пацвярджэння, падаходны падатак утрымліваецца па стаўцы 13% і пералічваецца ў бюджэт ва ўстаноўленым парадку.

**Калі кліент часткова здымае грошы з рахунку, то лічыцца, што ён здымае іх з той часткі, якая мае найменшы тэрмін фактычнага размяшчэння**

Напрыклад, згодна з нормамі адпаведнага пагаднення паміж урадамі Беларусі і Расіі аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання, працэнты, якія выплачваюцца беларускімі банкамі грамадзянам РФ, калі апошнія прад'явілі агучанае пацвярджэнне, абкладаюцца падаходным падаткам у нашай краіне па стаўцы 10 працэнтаў.

Вяртанне раней аплачанага (утрыманага) падаходнага падатку, у дачыненні да якога міжнароднымі дагаворамі Беларусі па пытаннях падаткаабкладання прадугледжаны іншыя палажэнні, чым тыя, якія дзейнічаюць у краіне, ажыццяўляецца падатковым агентам (банкам) у беларускіх рублях пасля падачы фізічнай асобай пацвярджэння і заявы аб вяртанні падатку.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

***У наступнай публікацыі на гэту тэму мы раскажам аб тым, які прыбытак могуць атрымаць пакупнікі нацыянальных каштоўных папер. Прынамсі, карыснай будзе інфармацыя наконт таго, што беларускія валютныя аблігацыі падаходным падаткам у найбліжэйшыя гады абкладацца ўвогуле не будуць.***

■ Маёмасць

# ПЕРШЫЯ ВІРТУАЛЬНЫЯ ТАРГІ

**Адразу шэсць лотаў былой сацыяльнай сферы выстаўлены Мінскім абласным тэрытарыяльным фондам дзяржаўнай маёмасці на электронны аўкцыён, які адбудзецца сёлета 29 сакавіка.**

У прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па маёмасці паведамілі, што менавіта цэнтральны рэгіён краіны першым адкрывае метад электронных таргоў у Беларусі па продажы дзяржаўнай маёмасці ў новым фармаце. Сёння гэтая маёмасць прапануецца да продажу з адначасовым прадастаўленнем зямельнага ўчастка ў арэнду без правядзення аўкцыёну і спагнання платы за права заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка.

Цяпер фондам «Мінскаблмаёмасць» прапануюцца на таргі некалькі пабудоў дзіцячага садка і абсталяванне ў Мінскім раёне, будынак Астроўскага вучэбна-вытворчага камбіната працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі вучняў у Чэрвеньскім раёне. Патэнцыйным пакупнікам прапануюцца аб'екты нерухомасці дзіцячага аздараўленчага лагера «Зорка» ў Лагойскім раёне; будынкі, збудаванні і абсталяванне аздараўленчых лагераў «Чайка» ў раёне пасёлка Калодзішчы (Мінскі раён), а таксама «Мара», які знаходзіцца ў раёне аграгарадка Астрашыцкі. Акрамя таго, на электронныя таргі абласным фондам выстаўлены будынак і абсталяванне школы, што размешчаны ў Стаўбцоўскім раёне.

Спецыялісты Дзяржкаммаёмасці паведамляюць, што ўся дакладная інфармацыя аб правядзенні таргоў, найменні лотаў, іх месцазнаходжанні, аб пачатковай цане, даце і часе правядзення таргоў, а таксама аб даце і часе заканчэння прыёму заяў на ўдзел у таргах, размешчана на электроннай гандлёвай пляцоўцы акцыянернага таварыства «Беларуская універсальная таварная біржа».

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

**ОАО «Белхудожкерамика»**
**уведомляет о проведении годового общего собрания акционеров**
**30 марта 2016 года в 14.00**
**по адресу: г.п. Радошковичи Молодечненского района Минской области, ул. Советская, 12**

**Повестка дня:**
1. Отчет директора ОАО «Белхудожкерамика» о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2015 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета за 2015 год.
3. Отчет ревизионной комиссии ОАО «Белхудожкерамика».
4. Утверждение бухгалтерского баланса и годовых отчетов общества за 2015 год.
5. Определение порядка распределения чистой прибыли ОАО «Белхудожкерамика» и выплаты дивидендов на 2016 год.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества, установление размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

УНП 600077830

Утерянные страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0760854-0760857, 0765194, 0765873, 0765887, 0869348, 0883792-0883793, страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВА №3953984 **считать недействительными.**

УНП 100706519

■ Выпрабавана на сабе

# ЯК МЫ РАЗМАЎЛЯЛІ ПА-БЕЛАРУСКУ

## ЖУРНАЛІСТЫ ВЫДАВЕЦКАГА ДОМА «ЗВЯЗДА» СТАЛІ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ ПЕРАДАЧЫ НА ТЭЛЕКАНАЛЕ «БЕЛАРУСЬ 3»

**Днямі творчы дэсант Выдавецкага дома «Звязда» накіраваўся ў Гомель. Толькі гэтым разам не дзеля таго, каб сустрэцца з героямі будучых публікацый, завітаць на пэўнае прадпрыемства або наведаць цікавую імпрэзу. Мы прыехалі, каб... размаўляць па-беларуску.**



Падчас гульні. Каманда «Палымяныя вожыкі»: Ганна КІСЛУШЧАНКА, Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ і Кацярына ЗАХАРЭВІЧ *(злева направа)*.
Каманда «Звяздоўцы» ў складзе Ірыны АСТАШКЕВІЧ, Веранікі КАНЮТЫ і Ільы КРЫЖЭВІЧА *(злева направа)*.

«Дык чаму ж адразу ў Гомель? Няўжо ў сталіцы з гэтым праблемы?» — спытае цікаўны чытач. Вядома ж, ніякіх праблем і абмежаванняў! Для нас, журналістаў беларускамоўных выданняў, родная мова — галоўны інструмент нашай дзейнасці. Ды і па-за межамі рэдакцыі беларускае слова заўсёды з намі.

А ў Гомель прыехалі невыпадкова. Менавіта тут, у горадзе над Сожам, здымаюць тэлевіктарыну «Размаўляем па-беларуску», якую можна ўбачыць кожную суботу ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3». Нагадаем, па правілах гульні, спаборнічаюць дзве каманды. У кожнай — па тры чалавекі. На працягу некалькіх этапаў тэлевіктарыны гульцы дэманструюць сваё веданне роднай мовы і культуры, а разам з тым набіраюць балы — у выніку вызначаецца пераможца.

### ПАЗНАЁМІМСЯ

Гэтым разам арганізатары «сутыкнулі лбамі» адзін калектыў. Першую каманду прадставілі супрацоўнікі газеты «Звязда»: Ірына Асташкевіч, Ілья Крыжэвіч і аўтар гэтых радкоў. Мы доўга не мудрылі і ахрысцілі сябе «Звяздоўцамі» — так спрадвеку называюць супрацоўнікаў газеты ў журналісцкай супольнасці, ды і самім такая назва даспадобы. Нашы сапернікі сваёй камандзе далі назву «Палымяныя вожыкі».

— Я прадстаўляю калектыў часопіса «Полымя», Ганна Кіслушчанка працуе ў «Вожыку», а Каця Захарэвіч — з «Маладосці». Таму і назвалі каманду «Палымянымі вожыкамі». Тое, што мы маладыя, і так відавочна, — абгрунтавала сваё рашэнне капітан каманды, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Алена Мальчэўская. Капітанам жа нашай каманды абралі мяне.

### ЗА КУЛІСАМІ...

У тэлестудыю мы прыехалі загадзя. І не дзеля таго, каб папіць гарбаты, якую нам адразу ж прапанавалі ветлівыя супрацоўнікі тэлебачання. Вядома, пасля пяцігадзіннай паездкі ў цягніку гэта было не лішнім. Праўда, для тых, каму ў гэты час не накладвалі грым — такія правілы тэлевізійных здымак.

Адзін за адным мы апускаліся ў крэсла перад люстэркам, і чараўніца Галіна рабіла з нас прыгажуняў і прыгажуноў — на гэтым месцы пабываў і наш адзіны юнак Ілья. Ён сарамліва назіраў за тым, як касметычны пэндзаль распыляў па ягоным твары пудру, а грэбень прыводзіў у прыстойны выгляд непрычэсаныя пасля цягніка валасы. Нам жа, дзяўчатам, сядзець перад люстэркам было звыкла і даволі прыемна: гэтым разам мы проста адпачывалі.

З тэлевядучай — Аленай Трацэнкай — мы сустрэліся ў грымёрнай. Яна прыйшла загадзя, з кожным з нас пазнаёмілася і настроіла на добрую гульню. Зайшла сюды і галоўны рэжысёр. Вікторыя Дубавец расказала, як будзе адбывацца здымачны працэс і дала нам некаторыя рэкамендацыі.

### РЫХТУЕМСЯ



Нягледзячы на тое, што Ілья КРЫЖЭВІЧ працаваў на тэлебачанні, грым яму накладваюць упершыню.

Нарэшце, мы на здымачнай пляцоўцы. Утульны пакойчык сустрэў нас яркім святлом пражэктараў і вельмі добразычлівай атмасферай. Адразу адчулася, што над праграмай працуе адна каманда. Мы вызначыліся, хто дзе будзе стаяць, і занялі свае месцы. Гукарэжысёр Алена Цяленчанка прычапіла да нашага адзення незаўважныя для гледача мікрафончыкі і пачала правяраць гук. Вядучая сходу задала некалькі пытанняў, каб мы на практыцы зразумелі, калі трэба націскаць кнопку і ў якім парадку адказваць.

Пакуль рэпеціравалі, у студыю завітаў Святаслаў Крупенька — выкладчык беларускай мовы і літаратуры, моваазнаўца. Эксперт праграмы не заўсёды прысутнічае падчас здымак, але гэтым разам адклаў усе свае справы і прыехаў — вельмі ж карцела яму пазнаёміцца з журналістамі. І нам было прыемна, што мелі магчымасць асабіста пагутарыць з лінгвістам.

### УВАГА! КАМЕРА

Музычная застаўка тэлевіктарыны, якую мы ўсе ўбачылі на экранах у студыі, сведчыла аб тым, што здымкі пачаліся. Алена Трацэнка адкрыла чарговую перадачу і прадставіла кожнага з нас. Капітаны, у сваю чаргу, патлумачылі, чаму так, а не інакш, называюцца каманды.

Пачаўся першы этап тэлевіктарыны — «Прыгадваем». На экране адна за адной з'яўляліся карцінкі са схемай слова. Адкрытая ў ёй літара спрашчала нам і без таго нескладаную задачу — назваць слова па-беларуску. Для нас, людзей, якія штодзень размаўляюць на роднай мове, гэта было вельмі проста. Але тут усё вырашалі не веды, а рэакцыя: хто хутчэй націсне кнопку, той і адказвае. Нягледзячы на тое, што «за штурваламі» знаходзіліся капітаны, магчымасць агучыць правільны варыянт мелі ўсе ўдзельнікі камандаў.

У другім раўндзе, які называўся «Перакладаем», на загадкавыя кнопкі панаціскалі ўсе гульцы. Кожнай пары з супрацьлеглых камандаў для перакладу з рускай мовы прапаноўваліся словы, словазлучэнні і сказы. З гэтым справіліся бездакорна, толькі зноў жа ўсё вырашыла кнопка: хто хутчэй націсне — той і адказвае. Нават удакладненні і варыяцыі прапанаваных для перакладу моўных адзінак не дапамагалі зарабіць балы камандзе, якая не паспявала націснуць кнопку.

А вось у трэцім туры ад гэтай пластыкавай паненкі нічога не залежала. Кожная каманда па чарзе павінна была растлумачыць сэнс беларускіх слоў — у асноўным рэдка ўжывальных. З трох варыянтаў, якія агучвала моладзь, трэба было выбраць адзін. Некаторыя словы мы чулі ўпершыню, таму даводзілася фантазіраваць. Пасмяяліся ўволю!

Больш упэўнена сябе адчувалі ў наступным конкурсе. Кожнай з камандаў быў прапанаваны фразеалагізм. За дзве хвіліны трэба было патлумачыць сэнс устойлівай адзінкі, знайсці яе рускамоўны ці беларускамоўны адпаведнік і скласці з першапачатковым фразеалагізмам сказ. Вось тут і паказалі свае веды!

**13.10, 0.00, 3.10** Зрабі або памры.
**13.30, 0.25, 3.30** Навуковыя недарэчнасці.
**13.55** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.40** Апакаліпсіс. Першая сусветная вайна.
**16.20** Грашовае сховішча ЗША.
**17.05** Навука будучыні.
**17.50** Чалавек супраць YouTube.
**21.00, 0.50, 3.55** Даследчык 2.0.
**22.30** Прарыў.
**23.15, 2.20** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00** Стальныя хлопцы.
**8.50, 15.15** Зорнае выжыванне.
**9.45, 1.00** Чыгунка Аляскі.
**10.40** Апошнія жыхары Аляскі.
**11.35, 4.50** Аляска: апошні рубеж.
**12.30, 20.00** Залатая ліхаманка.
**14.20** Востраў.
**16.10** Бягом па Брытаніі.
**17.05, 21.00, 5.40** Паляўнічыя на рачныя дыяменты.
**22.00** Даліны смерці.
**23.00** А ты б выжыў?
**0.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**2.00** Мяцежны гараж.
**3.00** Паляўнічыя на старызну.
**4.00** Мужчыны, жанчыны, прырода.

■ Усім светам

# НЕ СТОЛЬКІ БАРАЦЬБА...

## Наспеў час звярнуць увагу на даступнасць лячэння ад нарказалежнасці

**За некалькі тыдняў да пачатку спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па сусветнай праблеме наркотыкаў апублікаваны гадавы даклад Міжнароднага камітэта па кантролі над наркотыкамі за 2015 год. Важная для сесіі частка даклада прысвечана праблеме здароўя і дабрабыту — і менавіта з гэтым, а не з аб'яўленнем новай вайны наркотыкам будзе звязана будучая наркапалітыка.**



Паводле слоў **каардынатара Аб'яднанай праграмы ААН па барацьбе з ВІЧ/СНІД Веры ІЛЬЯНКОВАЙ**, на красавіцкай сесіі Генасамблеі абмяркуюць поспехі і няўдачы правядзення мерапрыемстваў, прадугледжаных міжнароднымі канвенцыямі ААН аб кантролі над наркотыкамі: «Існуе тры такія канвенцыі — аб наркатычных сродках, аб псіхатропных рэчывах і аб барацьбе супраць незаконнага абароту наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Фактычна ўсе дзяржавы — члены ААН ратыфікавалі гэтыя міжнародныя дакументы. Галоўная мэта ўсіх трох — менавіта ахова здароўя і дабрабыту кожнага паасобку і грамадства ў цэлым».

Аднак на практыцы асноўныя сродкі і намаганні скіроўваліся на барацьбу з незаконным абаротам наркотыкаў, папярэджванне іх ужывання. Але наспеў час звярнуць увагу на даступнасць паслуг па лячэнні нарказалежнасці, а таксама доступ да наркатычных сродкаў і псіхатропаў у медыцынскіх мэтах. Шэраг краін, якія прынялі канвенцыі, ігнаруюць гэтыя два моманты. Так, у свеце ўсяго 8 працэнтаў людзей, якія ўжываюць наркотыкі, маюць доступ да замяшчальнай тэрапіі. Неабходнасць укаранення такога метаду лячэння нарказалежнасці тлумачыцца рэальнай магчымасцю знізіць і прадухіліць выпадкі передазіроўкі, распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі, гепатытаў.

Прыкладна тры чвэрці сусветнага насельніцтва не маюць доступу да належнага абязбольвання. Доступ да наркасродкаў у медыцынскіх мэтах — напрыклад, для купіравання болю пры анкалагічных захворваннях — таксама ігнаруецца многімі дзяржавамі.

— У нас доступ да такіх анальгетыкаў даволі добры, рэалізуецца і праграма замяшчальнай тэрапіі, — тлумачыць **галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Іван КАНАРАЗАЎ**. — Для аказання дапамогі нарказалежнаму дзейнічае комплексны падыход — фармакатэрапія, паслугі псіхолага і сацыяльнага работніка. Наркалагічныя клінікі ажыццяўляюць вельмі вялікую работу ў гэтым кірунку і сёння могуць забяспечыць пацыентам увесь «спектр» паслуг — ад неадкладнай медпамогі да рэабілітацыі.

**Святлана ПРОТАС.**
*protas@zviazda.by*

**У ТЭМУ**

**ЦІ ТРАПЛЯЮЦЬ У НАШАЙ КРАІНЕ НАРКАСРОДКІ З ЛЕГАЛЬНАГА АБАРОТУ Ў НЕЛЕГАЛЬНЫ?**

*Гэта выключныя, адзінкавыя выпадкі, і ўсе яны выяўляюцца. Жорсткая рэгламентацыя захоўвання і водпуску наркатычных сродкаў у медыцынскіх мэтах, вялікі дакументаабарот, вялікая колькасць людзей, якія прымаюць рашэнне аб прызначэнні, не дазваляюць гэтым выпадкам стаць больш частымі.*

**КОЛЬКІ Ў НАС РЭАЛЬНА НАРКАЗАЛЕЖНЫХ?**

*Існуе дзве лічбы. Першая фіксуе колькасць залежных на дыспансерным уліку, другая абазначае так званую ацэначную колькасць. Так, па звестках эпідэміялагічнага нагляду, за мінулы год у Беларусі было 66,5 тысячы нарказалежных (некалькі гадоў таму — 75 тысяч).*

*У Еўрапейскім саюзе забароненыя наркотыкі хоць бы раз у жыцці паспрабавала амаль чвэрць дарослага насельніцтва (найбольшая колькасць аматараў — у Даніі, Злучаным Каралеўстве і Францыі). Праблему ўяўляюць не толькі гераін ці амфетаміны, але і новыя псіхаактыўныя рэчывы.*

**ЛЯЧЭННЕ ЦІ ПАКАРАННЕ?**

*ААН не падтрымлівае практыку крымінальнай адказнасці за ўжыванне наркотыкаў. Лічыцца, што размова ідзе пра захворванне, а хворыя маюць права на медыцынскую дапамогу, сацыяльную і псіхалагічную падтрымку. Аднак у некаторых краінах існуе крымінальная адказнасць за ўжыванне. У нас, напрыклад, наркотыкі прызнаюцца аднназначным злом і даўно не дзеліцца на «лёгкія» і «цяжкія». Тая ж нібыта лёгкая марыхуана хоць і фарміруе спачатку толькі згубную звычку, паступова перарастае ў псіхалагічную залежнасць. А вельмі працяглае ўжыванне канабісу, як паказваюць навуковыя даследаванні замежнікаў, прыводзіць да зніжэння інтэлекту.*

■ Машына часу

# Спатканне скрозь стагоддзі

## Мінчанам і гасцям сталіцы прапануюць гістарычны інтэрактыў

**Вам ніколі не даводзілася вырашаць чыесьці лёсы? А калі яны знаходзяцца ў розных часавых вымярэннях? Такую магчымасць прапануюць у Музеі гісторыі горада Мінска.**

Ён — стрыманы, мужны, шчыры, ветлівы, часам звычайны, марыць сустрэць Яе. Але Ён — герой вайны 1812 года... Яго рэальнасць — «Карэтная» на Зыбіцкай... Менавіта тут Ён, апрануты ў мундзір радавога Мінскага пяхотнага палка 1811–1815 гадоў, чакае сваю Адзіную.

А Яна — прыгожая, дзёрзкая, бясстрашная, крыху наіўная, і таксама хоча спаткаць Яго. Падрыхтавалася: убралася ў французскую дзённую сукенку з шоўку і аксаміту. Вось толькі Яе час — мяжа XIX і XX стагоддзяў...



Абое яны — жыхары Мінска, сведкі розных гістарычных эпох. Як жа ім сустрэцца? Свае літаратурныя фантазіі наведвальнікам экспазіцыі «Карэтная» Музея гісторыі Мінска прапануюць запісаць на аркушах і апусціць у «скрыню часу». Яна перанясе іх у эпохі, якія звяжуць герояў і дапамогуць ім спаткаць адно аднаго. Пісьмовыя прылады і літаратурны стол чакаюць наведвальнікаў у экспазіцыі ў Верхнім горадзе па адрасе вул. Кірылы і Мяфодзія, 8.

Такі інтэрактыў чакае кожнага ахвотнага, а аўтара найлепшай гісторыі супрацоўнікі музея абяцаюць узнагародзіць падарункам.

Палёту фантазіі паспрыяе не толькі атмасфера «Карэтнай» (калі вы там яшчэ не былі, абавязкова варта зазірнуць, каб даведацца, на чым ездзілі жыхары Мінска на мяжы XIX — XX стагоддзяў), але і гісторыя будынка, у якім цяпер знаходзіцца экспазіцыя.

У пачатку XIX стагоддзя паміж сучаснымі плошчай Свабоды, вуліцамі Кірылы і Мяфодзія і Герцэна стаяў мужчынскі кляштар манахаў-бернардзінцаў. У 1812 годзе, пасля ўступлення французскіх войскаў у Мінск, тут арганізавалі шпіталь для параненых французскіх салдат і афіцэраў. Магчыма, наш герой таксама трапіў у яго...



У 1817 годзе на тэрыторыі кляштара пачаліся будаўнічыя работы. Апроч іншага, быў пабудаваны і мураваны дом, які цяпер мае адрас Кірылы і Мяфодзія, 8. Але ў тыя часы ў ім жылі рамеснікі і чэлядзь манастыра. Таксама тут знаходзіўся бровар, невялікая саладоўня, а за ёй уладкавалі лазню.

Прайшоў час, адгрымелі два паўстанні (1830–1831 і 1863–1864 гадоў). Апошняе з іх паспрыяла таму, што касцёлы на беларускіх землях сталі закрываць і перадаваць праваслаўнай царкве. І хоць кляштар бернардзінцаў нікто не адабраў, сумны лёс не абмінуў і яго: у верасні 1864 года ён быў закрыты, а ўсе яго збудаванні паступілі ў распараджэнне горада.

У 1870 годзе ў будынку па вуліцы Манастырскай (гэта і ёсць цяперашні дом №8 на вуліцы Кірылы і Мяфодзія) вырашылі размясціць гарадскі аўкцыён і ламбард. Але ж будынак быў заняты: у ім знаходзілася пажарная часць. Тады ў доме дабудавалі другі паверх.

Ужо ў пачатку XX стагоддзя кіраўніцтва пажарнай каманды прапанавала праект будаўніцтва цэйхгаўза — гаспадарчай пабудовы для захоўвання інструментаў. Работы былі завершаны ў 1906 годзе: цэйхгаўз прыбудавалі да двухпавярховага дома пажарнай каманды і гарадскога ламбарда на месцы, дзе раней па вуліцы Зыбіцкай ішла драўляная агароджа...

Гэтыя пераўтварэнні, вядома, бачыла Яна. Але ці ведала Яна тады, што ў XXI стагоддзі лёс прывядзе яе ў будынак былога цэйхгаўза, дзе ў 2014-м адкрылі «Карэтную», каб праз стагоддзі спаткацца з Ім?..

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*
**Фота аўтара**

■ Неасабісты суб'ектыў

# КАШТОЎНЫ ДОСВЕД,



## або Дзе «купіць» пачак солі, пачак цукру і тры свечкі за дваццаць мільёнаў

ГІСТОРЫЯ, што адбылася нядаўна з пенсіянеркай з Мазыра — не гісторыя нават. Праўда, і не выпадак, і не здарэнне, бо і першае, і другое — гэта тое, што знянацку, нярэдка без волі і жадання чалавека адбываецца, а тут усё, як той казаў, у наяўнасці. Зрэшты, кароткую гісторыю гадоў сто пяцьдзясят таму адукаваныя людзі называлі анекдот. Дык вось, самы што ні ёсць анекдот і ёсць. Прычым у сучасным — смешным і нават крыху здзеклівым сэнсе.

Усё пачалося з таго, што ў сям'і нашай гераіні не было ладу — сын часта сварыўся з нявесткай. Маці, натуральна, перажывала, але рады даць не магла. Аднойчы сядзела яна перад тэлевізарам, глядзела нейкі жаночы кабельны канал і свае невясёлыя думкі думала. І, нібыта іх хтосьці ўгадаў, выскачыла раптам на экране рэклама: маўляў, экстрасэнс Надзея Іванаўна дапаможа справіцца з любымі жыццёвымі нягодамі. І нумар тэлефона з расійскім кодам. Жанчына тут жа кінулася яго набіраць. Пашанцавала: дазванілася з першага разу. Уважліва выслухаўшы яе праблему, «Надзея Іванаўна» тут жа выдала дакладны дыягназ: сурокі. Праўда, тут жа супакоіла: вельмі лёгка тыя чары здымаюцца. Трэба проста купіць у краме пачак солі, пачак цукру, тры свечкі. А на пэўны разліковы рахунак пералічыць зусім дробязь — як у пераводзе на нашы, беларускія, дык нейкія дзесяць мільёнаў.

Як вам такі «прадуктовы набор» за дзесяць мільёнаў? Ужо смешна? Пачакайце, гэта яшчэ пачатак. Грошы жанчына без сумненняў пераяла, соль, цукар і свечкі купіла. Увесь «чароўны рыштунак» выставіла на стол, наліла ў шклянку вады і набрала запаветны нумар. Той жа спагадлівы голас загадаў: запальвай свечкі і чытай уголас «Ойча наш»... Пенсіянерка натхнёна пачала вымаўляць першыя словы малітвы, але тут здарылася неспадзяванка: сувязь перарвалася. Працягнуць «сеанс» так і не ўдалося: на тым канцы праводу безапеляцыйна паведамілі, што пераведзеныя грошы скончыліся і трэба перавесці яшчэ столькі ж...

ШТО вы думаеце? Дзеля шчасця сына хіба шкада нейкіх там дзесяць мільёнаў? Пэўна, так думала і наша гераіня, калі пераводзіла чарговы «транш» у невядомым напрамку. Зноў паставіла на стале соль, ваду і цукар, зноў запаліла свечкі... Зноў у трубцы падазрона хутка «запікалі» кароткія гудкі. Праўда, «Надзея Іванаўна» паспела сказаць галоўнае: працэс ужо пайшоў і калі не давесці сеанс да канца, у сям'і сына будзе толькі горш... Што, несумненна, мела на ўвазе ўнясенне чарговых дзесяці мільёнаў. Але бабуля перазваньваць больш не стала: пэўна, грошы скончыліся. Пакуль ламала галаву, дзе іх узяць, па тым жа тэлеканале ўбачыла сюжэт аб затрыманні банды віртуальных махляроў, якія праводзілі за грошы сеансы магіі па тэлефоне... Жанчына кінулася ў міліцыю, але дзе Мазыр ці нават Гомель, а дзе тыя расійскія махляры, якія яна нават у вочы не бачыла?..

ШТО мяне асабіста ў гэтай гісторыі ды ў да яе падобных (а іх і ў міліцэйскіх зводках хапае, а колькі «ахвяр» проста пасаромеліся ва ўласнай дурасці прызнавацца) здзіўляе? Мы са смехам успамінаем саміх сябе часоў перабудовы, калі ўсёй сям'ёй, пакідаўшы важныя справы, сядзелі перад тэлевізарам падчас сеансаў Кашпіроўскага, сціснуўшы дыханне, чакаючы, што ўсе болькі балець перастануць, а ўсе шнары — разгладзяцца. Рагочам, згадваючы, як, бы святое прычасце, глыталі з чайнай лыжачкі ваду, якую «зарадзіў» перад тэлевізарам Чумак. А, калі разабрацца, разумнейшымі з тых часоў ні на каліва не сталі, хутчэй наадварот. Бо там мы хаця б ведалі ў твар тых, хто нас масава дурыць, глядзелі ў вочы — няхай і праз экран! — тым, каму верылі. Прычым — і ў гэтым самае істотнае адрозненне — не выкладалі за падобныя сеансы на адлеглаці ні капейкі з уласнай кішэні. «Ураджай» тэлеэкстрасэнсы збіралі пазней, калі раз'язджалі па дамах культуры з паказальнымі выступленнямі (і была ў гэтым логіка, бо аддавалі грошы калі не за цудоўнае вылячэнне, дык за шоу, якое «магі» на сцэне ладзілі)...

Цяпер жа гатовы аддаваць немалыя сумы невядома каму, гледзячы на карцінку ў сеціве ці чуючы голас па тэлефоне. Спадзеючыся на дапамогу нейкага далёкага мага ці шамана ў справах абсалютна нашых, асабістых, якія абсалютна ніхто, акрамя нас саміх, вырашыць не зможа: вярнуць каханага, памірыць сваякоў, дабудаваць дом...

ВЕДАЮ, пра што пішу, бо аднойчы (карціць напісаць: «дзеля журналісцкага эксперымента», але, калі ўжо быць шчырай, — з-за звычайнай бабскай цікаўнасці), спакусіўшыся рэкламай у інтэрнэце, вырашыла заказаць сабе персанальны гараскоп. Як абяцала «каманда прафесійных астролагаў, вучняў Тамары Глобы», менавіта ён дапаможа разабрацца ў самой сабе і паставіць жыццё ва ўсіх яго праявах на рэйкі поспеху. Для гэтага трэба было зусім няшмат: увесці дакладную дату і час свайго нараджэння, імя і поўны нумар мабільнага тэлефона — на яго павінна было прыйсці паведамленне з запаветным кодам, які трэба было ўвесці, каб атрымаць свой асабісты гараскоп і змяніць жыццё ў лепшы бок.

«Прафесійныя астрологі» не падманулі — код прыйшоў праз пятнаццаць хвілін. Набраўшы шэсць чароўных лічбаў, стала чытаць «падрабязны асабісты гараскоп». «Па знаку задыяка вы — Авен, па году — Тыгр. Вы — асоба надзвычай упартая і схільная да авантур. З-за гэтага ў вас усе непрыемнасці, а ў найбліжэйшы час вас чакаюць фінансавыя страты...» Усё. Колькі ні ганяла курсор па экране з надзеяй, што «працяг будзе», — нічога не выйшла. Толькі абяцаныя фінансавыя страты не прымусілі сябе доўга чакаць. З тэлефона (нумар якога так старанна ўпісвала дзеля атрымання чароўных лічбаў) спісалі... дзвесце тысяч рублёў.

ЯТАДЫ страшэнна на сябе раззлавалася, а цяпер вось думаю: за ўрок на ўсё жыццё не такая вялікая плата. У параўнанні з дваццацю мільёнамі, напрыклад.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

УНП 690654706

Открытое акционерное общество

## «Минобллифт»

Вид деятельности: монтаж электрообрудования зданий, включая лифты.
Адрес: 223053, Минская обл., Минский р-н, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, 21В

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года

| Наименование статьи | В миллионах белорусских рублей |
|---|---|
| **ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | |
| Основные средства | 56 |
| Нематериальные активы | 1 |
| Вложения в долгосрочные активы | 1 |
| Прочие долгосрочные активы | 6 |
| **КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | |
| Запасы | 86 |
| Расходы будущих периодов | 17 |
| Налоги по приобретенным ценностям | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 3483 |
| Краткосрочные финансовые вложения | - |
| Денежные средства | 36 |
| **БАЛАНС** | **3686** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | |
| Уставный капитал | 112 |
| Добавочный капитал | 15 |
| Нераспределенная прибыль | 58 |
| Целевое финансирование | - |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 95 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 3406 |
| **БАЛАНС** | **3686** |
| **ЧИСТЫЕ АКТИВЫ** | **185** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2015 по 31 декабря 2015 года

| Наименование статьи | В миллионах белорусских рублей |
|---|---|
| Выручка от реализации товаров, работ, услуг | 5 479 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | (3 873) |
| Управленческие расходы | (1 691) |
| Расходы на реализацию | - |
| Прибыль (убыток) от реализации | (85) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 2 691 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | (2 438) |
| Прибыль от текущей деятельности | 168 |
| Прибыль от инвестиционной и финансовой деятельности | (122) |
| Налог на прибыль | (41) |
| Чистая прибыль | 5 |

Согласно аудиторскому заключению ООО «Партнерaудит» бухгалтерская отчетность ОАО «Минобллифт» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Минобллифт» на 31 декабоя 2015 года и результаты его финансовой деятельности за 2015 год.

**Руководитель:** **Д.Н.Горох**
**Гл. бухгалтер:** **О.А.Ржеутская**

---

**22 марта 2016 года**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Вишневка-2010»

**С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

**1.** О перезаключении договора безвозмездного пользования нежилым помещением в административном здании ОАО «Вишневка-2010» для размещения районной библиотеки.

**2.** Об оплате жилья по договору найма молодым специалистам.

**3.** Об отчуждении неиспользуемого в хозяйственных целях здания специализированного для производства продуктов питания, включая напитки, и табака.

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться **22 марта 2016 года с 13.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, а.г. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 08.00 до 17.00 **с 14 марта по 22 марта 2016 года.** УНП 600041880

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **Мядельское райпо, Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | | |
| **Здание склада кожевенного сырья** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 510,1 кв.м | 633/С-11421 | Минская обл., Мядельский р-н, г. Мядель, пер. Заготовительный, д. 2 |
| Составные части и принадлежности | | забор из ж/б плит, металлические ворота | | |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания склада кожевенного сырья пл. 0.2672 га | | | | |
| **Начальная цена Лота №1 с НДС 20% – 400 000 000 белорусских рублей (снижена на 20%)** | | | | |
| **Лот №2** | | | | |
| **Кафе «Над озером»** | Здание специализированное для общественного питания | 234,3 кв.м | 633/С-11803 | Минская обл., Мядельский р-н, Нарочский с/с, д. Черевки, пер. Центральная, д. 67 |
| Составные части и принадлежности | Две беседки, покрытие из бетонной плитки | | | |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания кафе пл. 0.1300 га с установленными ограничениями водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос – озера Нарочь (пл. 0.100 га) | | | | |
| **Начальная цена Лота №2 с НДС 20% – 800 000 000 белорусских рублей (снижена на 20%)** | | | | |
| **Лот №3** | | | | |
| **Водонапорная башня** | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения | | 633/С-11171 | Минская обл., Мядельский р-н, к.п. Нарочь, ул. Песчаная, д. 21 |
| **Артскважина** | | | 633/С-11169 | |
| **Сведения о земельном участке:** для обслуживания зданий и сооружений продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. 0,2783 га. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона озера Нарочь. | | | | |
| **Начальная цена Лота № 3 с НДС 20% – 303 000 000 белорусских рублей (снижена на 50%)** | | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда»: по лоту №1 и №2 – от 12.01.2016, по лоту №3 – от 28.11.2015

**Аукцион состоится 04.04.2016 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.
Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 01.04.2016 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. **www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

---

Открытое акционерное общество

## «Радиотехника»

**ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**30 марта 2016 года в 15.00**

**по адресу: Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Я. Колоса, д. 1.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

**1.** Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Радиотехника» за 2015 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2016 год.
**2.** Отчет наблюдательного совета ОАО «Радиотехника» о проделанной работе в 2015 году.
**3.** О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Радиотехника», распределения прибыли и убытков ОАО «Радиотехника» за 2015 год.
**4.** Утверждение годовой бухгалтерской отчетности ОАО «Радиотехника» за 2015 год.
**5.** Об утверждении распределения и использования чистой прибыли (убытков). О выплате дивидендов за 2015 год.
**6.** Утверждение направлений распределения прибыли на 2016 год.
**7.** Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии ОАО «Радиотехника».
**8.** Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Радиотехника».
**9.** О внесении изменений в устав ОАО «Радиотехника».

Собрание проводится в очной форме. Время начала регистрации – 14.30. Акционеру иметь при себе паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – по состоянию реестра на 20.03.2016. Акционеры могут ознакомиться с материалами по собранию в рабочие дни, начиная с 23.03.2016 у председателя наблюдательного совета.

УНП 500227068

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Лесорама, инв. №2386, 1988 года выпуска, стоимостью 871 273 000 белорусских рублей;<br>**Лот № 2.** Комплект клеточного оборудования для содержания кур-несушек «Унивент-500», инв. №01101, 2007 года выпуска, стоимостью 232 907 849 белорусских рублей;<br>**Лот № 3.** Комплект клеточного оборудования для выращивания ремонтного молодняка кур-несушек ТВЦЕ, инв. №01068, 2005 года выпуска, стоимостью 357 967 209 белорусских рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Глубокская птицефабрика» (УНП 300019583) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Лот № 1 – Витебская область, Глубокский район, д. Мерецкие;<br>Лоты №№ 2, 3 – Витебская область, Глубокский район, д. Марцебылино, птичник 4,7. |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Банк БелВЭБ» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 25.03.2016 в 12.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1.<br>Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс 8(0212)614018, 8(033)6879145,<br>начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. 80336878807 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 24.03.2016.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

---

## БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

### сообщает о проведении 11 апреля 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Логойский район, д. Мерковичи, У-6, кадастровый номер земельного участка 623280405101000061 | 0, 1450 | Подъезд с грунтовой дороги, возможность подключения к коммуникациям | 75 000 000 | публикация в газете + 13 749 729 | 7 500 000 |
| 2 | Минская область, Логойский район, д. Мерковичи, У-8, кадастровый номер земельного участка 623280405101000060 | 0, 1450 | Подъезд с грунтовой дороги, возможность подключения к коммуникациям | 75 000 000 | публикация в газете + 13 749 729 | 7 500 000 |

***Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3600619011127 в ЦБУ № 611 филиала № 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 4901, получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.***

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками, выставляемыми на аукцион.

**Аукцион состоится 11 апреля 2016 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.**

Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

**Последний день приема заявлений – 5 апреля 2016 года до 17.00.**

Контактные телефоны: (801774) 58436, 58445.

---

## ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

### сообщает о проведении 13 апреля 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Понизовье, ул. Центральная, д. 35А 623284604601000142 | 0,1482 | водоснабжение | 25 812 900 | 16 046 700 + реклама | 2 581 300 |
| 2 | д. Понизовье, ул. Руднянская, д. 3 623284604601000149 | 0,1400 | водоснабжение | 24 384 600 | 13 449 700 + реклама | 2 438 500 |

Земельный участок в д. Понизовье, ул. Центральная, д. 35А имеет ограничения в использовании площадью 0,1482 га в связи с расположением в водоохранной зоне реки Гайна, земельный участок в д. Понизовье, ул. Руднянская, д. 3 имеет ограничения в использовании площадью 0,1400 га в связи с расположением в водоохранной зоне реки Гайна и площадью 0,0112 га в связи с расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт.

*Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901.* Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 13 апреля 2016 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. Последний день приема заявлений – **7 апреля 2016 года до 17.00.**

Контактные телефоны: (801774) 55056, 55473.

---

### РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона

## ПО ПРОДАЖЕ НАСОСНОЙ СТАНЦИИ, ОПЕРАТОРНОЙ, принадлежащей ООО «СЛАВЯНСКИЙ РЕСУРС»

| Лот № 1 | Насосная станция, операторная с инв. № 600/С-139558 | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Привокзальная, д. 2 | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток, $ США |
|---|---|---|---|---|
| | | | **380 000** | **10 000** |

Назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. Дата ввода в эксплуатацию – 31.12.2012. Общая площадь застройки – 499 кв.м. Составные части и принадлежности: - Насосная станция, операторная литер А: площадь – 23,9 кв.м; - Комплекс стальных резервуаров для хранения масла с 2 резервуарами емкостью 400 м$^3$ литер Б и резервуаром емкостью 200 м$^3$ литер В; - Площадка для разгрузки литер Г: площадь застройки – 6 кв.м.; - Площадка литер Д: площадь застройки – 259 кв.м.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,5854 га с кадастровым номером 641500000001001677. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания существующих строений и сооружений производственной базы. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения), устанавливаемые в отношении недвижимого имущества, находящегося в водоохранных зонах водоемов: водоохранная зона Заславского водохранилища, площадь 0,5854 га. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
Валюта торгов – доллар США. Валюта платежа – белорусский рубль.
Оплата производится следующим образом:
- оплата 50% (Пятьдесят процентов) стоимости Объекта – в день подписания договора купли-продажи Объекта;
- оставшаяся сумма – в течение 30 (тридцати) дней с даты подписания договора купли-продажи Объекта.
В случае непоступления второго платежа, первая сумма не подлежит возврату.
Сумма для оплаты Объекта производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1,5% (Одного целого пяти десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Сумма для оплаты вознаграждения производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на дату подписания протокола о результатах аукциона.
Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 12.04.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже насосной станции, операторной ООО «СЛАВЯНСКИЙ РЕСУРС»,* **проводимом 12 апреля 2016 г.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **08.04.2016 в 12.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Палазник Герасим Викторович, 8 (029) 679-79-12.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# МАСЛЕНІЦА ІДЗЕ...

**Па гарызанталі: 1.** Дзень масленічнага тыдня, калі зяці прыходзілі да сваіх цешчаў «на бліны». **4.** Масленіца ідзе, блін ды ... нясе (прык.). **6.** Бліны — сонцу ... (прык.). **9.** ... вясны. Старажытны беларускі абрад, які пачынаўся на Масленіцу і дасягаў кульмінацыі на Дабравешчанне (7 красавіка). **11.** Кіславаты напітак. **13.** І кошка бліноў напячэ, калі ... сцячэ (прык.). **16.** Тое, чым на першы дзень Вялікага посту (14 сакавіка) выкалупвалі з зубоў скаромнае, і гарэлкай паласкалі рот. **17.** Жаданне, патрабаванне. **18.** Паўднёвая расліна з пахучымі белымі кветкамі. **19.** На Дабравешчанне зіму не лай і ... трымай (прык.). **22.** Рыбалоўны кручок (разм.). **23.** Дзень масленічнага тыдня, які называлі «цешчыны вячоркі»; у гэты дзень зяці запрашалі цешчаў да сябе ў госці. **25.** Дарожны куфэрак. **27.** Чужыя грошы — ... (прык.). **28.** Тое, што і прыгожы (нар., паэт.).

**Па вертыкалі: 1.** Невялікая шкляначка, часта на ножцы. **2.** Кароткі пушок на паверхні некаторых тканін. **3.** Страва. **5.** Моцны крык. **6.** Тое, што і песня. **7.** Майстар сваёй справы. **8.** Мусульманская рэлігія. **10.** «А ў нас сёння ..., ...// А з-пад куста ластаўка, ластаўка». З масленічнай песні. **12.** Дзівак, своеасаблівы чалавек (разм.). **14.** Пункт вартавання, пост. **15.** Вясной карову за ... падымай (прык.). **20.** «Надакучыла ж зіміца! // Прыходзі хутчэй, ...». З паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка». **21.** ... і пацалункі лік не любяць (прык.). **23.** «Ой, у полі, у полі ... лятала//Лелёй, лелёй, лелёй, лей!//... лятала, пер'е раняла». З вяснянкі. **24.** Гатунак белай гліны, што ідзе на выраб фаянсу. **25.** «Памажы, маці, нам вясну гукаці//..., дай, ..., дай». З вяснянкі. **26.** Першая нота музычнай гамы.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*



**Праверце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі: 1.** Чацвер. **4.** Мёд. **6.** Сваякі. **9.** Гуканне. **11.** Квас. **13.** Сала. **16.** Шыла. **17.** Воля. **18.** Мірт. **19.** Сані. **22.** Якар. **23.** Пятніца. **25.** Баул. **27.** Аскома. **28.** Красны.

**Па вертыкалі: 1.** Чарка. **2.** Ворс. **3.** Рагу. **5.** Ёкат. **6.** Спеў. **7.** Ас. **8.** Іслам. **10.** Масленка. **12.** Арыгінал. **14.** Варта. **15.** Хвост. **20.** Вясна. **21.** Бліны. **23.** Пава. **24.** Апак. **25.** Божа. **26.** До.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.34 | 19.07 | 11.33 |
| Віцебск — | 7.24 | 18.55 | 11.31 |
| Магілёў — | 7.24 | 18.57 | 11.33 |
| Гомель — | 7.19 | 18.54 | 11.35 |
| Гродна — | 7.49 | 19.22 | 11.33 |
| Брэст — | 7.48 | 19.24 | 11.36 |

**Месяц**

*Маладзік 09.03 — 14.03.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

*Пр. Ганны, Івана, Пятра, Сяргея.*
*К. Бенядзікта, Канстанціна.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +4..+6°C | КІЕЎ +8..+10°C | РЫГА 0..+2°C |
| ВІЛЬНЮС +3..+5°C | МАСКВА 0..+2°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +1..+3°C |

Даты | Падзеі | Людзі

**11 САКАВІКА**



**1878** год — на пасяджэнні Французскай акадэміі навук адбылася дэманстрацыя фанографа Томаса Эдысана, патэнт на вынаходства якога ён атрымаў літаральна за месяц да гэтага. Дэманстраваў навінку супрацоўнік вынаходніка, адзін з піянераў тэлефаніі, распрацоўшчык першай у свеце тэлефоннай станцыі на два дзясяткі абанентаў, венгерскі інжынер Тывадар Пушкаш. Ён паказаў паважанай навуковай супольнасці, як пры прайграванні запісу гуку іголка, рухаючыся па канаўцы, перадае ваганні на пругкую мембрану, якая выраблюе гук. Усё спачатку ішло гладка, але аказалася, што не ўсе свяцілы французскай навукі адэкватна ўспрынялі «машыну, якая размаўляе». На дэманстрацыі адбыўся кур'ёзны выпадак. Калі са скрыні пачуўся голас, прафесар-філолаг Жан Буйяр накінуўся на інжынера Пушкаша са словамі: «Нягоднік! Вы думаеце, мы дазволім чэрававяшчальнікам ашукваць нас?! Як вы маглі паверыць ашуканцу, які пераконвае нас, што нікчэмны метал можа прайграваць высакародныя гукі чалавечай гаворкі?..» На самай жа справе вынаходства стала сапраўднай дзівоснай падзеяй таго часу.

**1910** год — нарадзіўся Канстанцін Канстанцінавіч Кокінакі, заслужаны лётчык-выпрабавальнік СССР, Герой Савецкага Саюза, палкоўнік. У час Вялікай Айчыннай вайны камандаваў 401-м знішчальным авіяцыйным палком. У 1942-1950 гадах праводзіў выпрабаванні серыйных самалётаў МіГ. З 1951 года працаваў у канструктарскім бюро А.І. Мікаяна. У 1960 годзе на самалёце Е-66 устанавіў абсалютны сусветны рэкорд хуткасці палёту па замкнутым маршруце 100 км — 2148,66 км у гадзіну.

**1911** год — 105 гадоў таму нарадзіўся (г. Ліда) Аркадзь Бейнусавіч Мігдал, савецкі вучоны-фізік, акадэмік АН СССР. У 1936 годзе скончыў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт. Працаваў у Інстытуце фізічных праблем, Інстытуце атамнай энергетыкі, Інстытуце тэарэтычнай фізікі АН СССР. Аўтар навуковых даследаванняў па атамнай і ядзернай фізіцы, квантавай тэорыі поля і іншых праблемах сучаснай тэарэтычнай фізікі. Памёр у 1991 годзе.

**Было сказана**

**Аркадзь КУЛЯШОЎ, народны паэт Беларусі:**
*«Раны гояцца часам, а дружбаю — гора».*

■ Вясновае

## НЕ ЗБІРАЦЬ ПЕРШАЦВЕТЫ, А ЛЮБАВАЦЦА ІМІ

### заклікае нас інспекцыя па ахове жывёльнага і расліннага свету

**Брэсцкая абласная інспекцыя размясціла інфармацыю на гарадскіх сайтах, а таксама даслала пісьмы ў сродкі масавай інфармацыі з просьбай разгарнуць кампанію па абароне першацветаў.**



Першыя вясновыя кветкі ўжо з'явіліся ў паўднёвых раёнах Брэстчыны. Але людзі, бываючы ў лесе, амаль заўсёды стараюцца сабраць букецік. Ды кволыя і далікатныя краскі хутка вянуць у вадзе. А з-за варварскай нарыхтоўкі, як сцвярджаецца ў пісьме, іх з кожным годам становіцца меней, асабліва ў ваколіцах гарадоў. Некаторыя суайчыннікі нават не ведаюць, што большасць першацветаў уключана ў Чырвоную кнігу Беларусі, за іх збор прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

Калі мы купляем букецік духмянай пралескі на рагу вуліцы, мы стымулюем браканьераў — націскаючы на нашу свядомасць аўтары памянёнага пісьма. І сапраўды, японцы, калі сузіраюць квітнеючую сакуру, не ламаюць яе галінкі, каб занесці дадому. Можа і нам нейкім чынам укараняць моду на любаванне кветкамі ў натуральным прыродным асяродку? Тым больш што ў нашых шыротах іх не так і многа.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі раніцай жонка вас будзіць словамі: «Прачніся, мілы, я прыгатавала табе твой любімы сняданак», значыць:**

**а) вы заснулі ў палюбоўніцы,**

**б) вы яшчэ не прачнуліся,**

**в) напярэдадні вечарам яна купіла дарагую сумку,**

**г) абед вам будзе падаваць цешча, якая прыехала пагасціць на месяц,**

**д) ноч удалася,**

**е) напярэдадні вечарам вы прыйшлі дадому як бэля п'яны і, калі яна дапамагала вам распрануцца, сказалі ёй: «Адчапіся, я жанаты!»,**

**ж) на вуліцы дождж, і трэба выгульваць сабаку,**

**з) калі ваша жыццё застрахавана, пераканайцеся, што кава не пахне антыфрызам.**

Вырашыў папесціць жонку стрыптызам... Увесь выхадны на канапе ў трусах валяюся.




Малюнак Алега ПАПОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.108. Індэкс 63850. Зак. № 1048.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 сакавіка 2016 года.